*С.М.ГАНЧАР*

# ПРАБЛЕМЫ ЎРАТАВАННЯ І ЗАХАВАННЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ЗОНЕ

*Аўтар аналізуе стан захавання і вывучэння гісторыка-культурнай спадчыны ў раёнах чарнобыльскай зоны. На аснове вывучэння літаратуры, аналізу дзейнасці навуковых і дзяржаўных устаноў па названых праблемах робіць адпаведныя высновы.*

У адселенай чарнобыльскай зоне засталася фактычна безабаронная найбагацейшая гісторыка-культурная спадчына.

Паводле даследавання, праведзенага ў 1992–1997 гг. Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыяй па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры Беларусі чарнобыльскай зоны (начальнік Дзяржэкспедыцыі М.М.Філістовіч), у дзесяці найбольш пацярпелых раёнах Гомельскай вобласці (Брагінскім, Нараўлянскім, Хойніцкім, Веткаўскім, Чачэрскім, Кармянскім, Добрушскім, Буда-Кашалёўскім, Лельчыцкім, Ельскім) і шасці раёнах Магілёўскай вобласці (Краснапольскім, Касцюковіцкім, Слаўгарадскім, Клімавіцкім, Чэрыкаўскім, Быхаўскім) знаходзяцца 362 помнікі археалогіі часоў неаліту, бронзавага і жалезнага вякоў, ранняга феадалізму, а таксама 1283 помнікі, звязаныя з гістарычнымі падзеямі і знакамітымі землякамі, 97 помнікаў мастацтва і архітэктуры (у тым ліку 18 помнікаў палацава-паркавай архітэктуры, 40 культавых будынкаў). Да аварыі ў гэтых раёнах было больш за 750 старадаўніх абразоў і каштоўных кніг, дзейнічалі 118 фальклорных калектываў, пражывалі 795 народных майстроў і ўмельцаў, 70 захавальнікаў вуснай народнай творчасці, працавалі 16 дзяржаўных і 79 грамадскіх музеяў, 437 бібліятэк [6, с. 69].

Чарнобыльская трагедыя стварыла рэальную пагрозу поўнай страты матэрыяльнай і духоўнай спадчыны значнай часткі Беларускага Палесся і Прыдняпроўя — унікальнага па сваіх асаблівасцях рэгіёну нашай краіны. На забруджаным абшары спыніліся развіццё і перадача маладому пакаленню векавых традыцый.

Што датычыцца каштоўнасцей мінуўшчыны, то менавіта тут, на тэрыторыі Калінкавіцкага (вёска Юравічы) і Чачэрскага (вёска Бердыж) раёнаў Гомельскай вобласці, выяўлены найбольш старажытныя стаянкі першабытнага чалавека ў Беларусі [7, с. 110].

Найбагацейшую гісторыю народных промыслаў (рамёстваў) і прылад (кузні, гантарэзкі, паравыя млыны, рудні, бровары, кросны і інш.) мелі жыхары адселеных вёсак Нараўляншчыны [1, с. 426–435]. Тут, у вёсках Даўляды, Дзёрнавічы, Ражава, Цешаў, дзе да 1986г. кіпела спрадвечнае сялянскае жыццё і гучалі мілагучныя палескія песні, у пакінутых хатах у 1993 г. яшчэ стаялі некранутымі ад рабавання незвычайныя вырабы бондарства (дзежы, дзежачкі), самабытная мэбля, адмыслова зробленыя грабяні, маслабойкі, самапрадкі, ганчарны посуд, куфры, жорны, посцілкі і ручнікі рэдкага хараства. Паводле меркавання ўдзельнікаў экспедыцыі аддзела старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1993) у чарнобыльскую зону, “такога багацця народнага мастацтва (як на Нараўляншчыне) мы не бачылі нідзе. Прыйшлі да высновы, што, напэўна, сёння ва ўсёй Еўропе няма больш багатага на народнае мастацтва рэгіёну” [9, с. 413–414].

На Веткаўшчыне перасталі існаваць унікальныя сваёй самабытнасцю цудоўныя асяродкі беларускай культуры (вёскі Амяльное, Барба – адно з першых пасяленняў стараавераў-раскольнікаў, якія ў пачатку XVIII ст. узніклі вакол Веткі, вёскі Баркі, Барталамееўка – цэнтр традыцыйнага народнага такарнага рамяства, вёска Беседзь – цэнтр падрыхтоўкі мясцовага насельніцтва пад кіраўніцтвам Яцэўскага для ўдзелу ў паўстанні 1863 г. [5, с. 392]).

Тое ж можна сцвярджаць і аб чарнобыльскай зоне Магілёўшчыны. У старажытнасці гэтая тэрыторыя была цудоўна прыстасавана прыродай для жыцця першабытных паляўнічых, рыбаловаў, пазней – земляробаў і жывёлаводаў. Яна была да чарнобыльскага выбуху своеасаблівым сховішчам тысяч матэрыяльных сведчанняў колішняй дзейнасці людзей: каменныя прылады працы і зброя, посуд і ўпрыгожванні з гліны, рэшткі жытла і гаспадарчых пабудоў [2, с. 41].

Разам з 362 помнікамі археалогіі ў чарнобыльскай зоне Гомельшчыны і Магілёўшчыны размяшчаецца мноства помнікаў архітэктуры і драўлянага дойлідства. Традыцыя драўлянага дойлідства, заснаваная на глыбокім веданні ўласцівасцей будаўнічых матэрыялаў, прастата і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дасціпнасць канструкцыйных прыёмаў сведчаць аб высокім майстэрстве дойлідаў, якое перадавалася з пакалення ў пакаленне. Жыллё палешукоў, маючы доўгую гісторыю развіцця, да нядаўняга часу захоўвала свае характэрныя асаблівасці.

Пасля чарнобыльскай катастрофы першыя чатыры гады вывучэнне і ўратаванне гісторыка-культурнай спадчыны ў населеных пунктах, адкуль людзі выселіліся, практычна не вяліся, многае беззваротна страчана.

У 1994 г. старшыня Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі М.Філістовіч з глыбокай заклапочанасцю пісаў, што "пасля чацвёртай, паводле нашых назіранняў, хвалі марадзёрства ў адселенай зоне (спачатку шукалі грошы і выпіўку, потым выносілі каштоўныя рэчы і адзенне, затым чарга дайшла да бытавой тэхнікі і мэблі, цяпер узяліся за будаўнічыя матэрыялы) можна сцвярджаць, што назаўжды страчаны многія старадаўнія абразы, каштоўныя кнігі, саматробныя мастацкія вырабы, прадметы антыкварыяту. Гэтага магло і не здарыцца, калі б адразу пасля аварыі на дзяржаўным узроўні была асэнсавана ступень пагрозы для нацыянальнай культуры і знайшліся энтузіясты сярод навукоўцаў, культработнікаў папрацаваць сярод насельніцтва і ўзяць гэтыя рэчы пад надзейнае захаванне ў музейныя фонды" [6, с. 70] .

Толькі ў канцы 1990 г. Гомельскім і Магілёўскім аблвыканкамамі былі створаны камісіі па абследаванні стану гісторыка-культурных каштоўнасцей і распрацаваны мерапрыемствы па іх захаванні ў адселеных пунктах і зонах радыяцыйнага кантролю.

Навуковая і творчая інтэлігенцыя, а таксама аматары аховы спадчыны гэтых абласцей забілі трывогу значна раней. Яшчэ ў верасні 1986 г. на базе гістарычнага факультэта Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя  А.Куляшова, археалагічнай секцыі абласнога савета Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры і Абласнога краязнаўчага музея быў створаны цэнтр археалагічных даследаванняў пры ўпраўленні культуры Магілёўскага аблвыканкама. У якасці першачарговай была пастаўлена задача выяўлення і ўліку помнікаў археалогіі ў раёнах чарнобыльскай зоны [2, с. 41].

У снежні 1990 г., паводле вынікаў работы спецыяльнай рэспубліканскай камісіі, Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з аблвыканкамамі былі зацверджаны мерапрыемствы па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны ў населеных пунктах Гомельскай і Магілёўскай абласцей, якія падлягаюць адсяленню людзей з забруджаных раёнаў і знаходзяцца ў зоне пастаяннага кантролю. Мерапрыемствы былі разлічаны на 5 гадоў (1991–1995), мелі 28 кірункаў дзейнасці. З канца 1991 года работа набыла агульнарэспубліканскі характар. Ва ўрад краіны быў накіраваны зварот аб фінансаванні праграмы за кошт сродкаў, якія прызначаліся Дзяржаўнаму камітэту Рэспублікі Беларусь (Дзяржкамчарнобыль) на ліквідацыю вынікаў катастрофы.

Такім чынам, хоць і са спазненнем, але быў зроблены вельмі патрэбны першы крок да вырашэння праблемы захавання і ўратавання гісторыка-культурнай спадчыны ў чарнобыльскай зоне.

Адначасова Міністэрствам культуры БССР была распрацавана спецыяльная Праграма збераджэння гісторыка-культурных каштоўнасцей у раёнах Беларусі, трапіўшых пад уздзеянне чарнобыльскай аварыі,разлічаная на фінансавую дапамогу Масквы і сусветнай супольнасці. Але распад СССР не дазволіў дасягнуць пастаўленай мэты. Вырашэнне ўсіх чарнобыльскіх праблем, у тым ліку захавання матэрыяльнай і духоўнай спадчыны ў пацярпелых ад аварыі раёнах, выпала на долю Рэспублікі Беларусь.

На выратаванне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны пацярпелага рэгіёну была накіравана дзейнасць Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі, створанай пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 26 сакавіка 1991 г., але яе практычная дзейнасць пачалася толькі з лістапада 1991 г. па прычыне маруднасці вырашэння арганізацыйных пытанняў.Ёй было даручана сумесна з зацікаўленымі ўстановамі распрацаваць праграму сваёй дзейнасці і неабходныя рэкамендацыі для міністэрстваў, аблвыканкамаў і ведам- стваў. Праграма складалася з плана навукова-даследчых работ у зоне і арганізацыйных мерапрыемстваў па выратаванні і захаванні помнікаў. У Гомельскай і Магілёўскай абласцях былі створаны філіялы Дзяржаўнай экспедыцыі. У 1992 г. упершыню асобным артыкулам "Ахова помнікаў" сталі выдаткоўвацца дзяржаўныя сродкі на гэтыя мэты.

Пасля першага года работы Дзяржэкспедыцыя сумесна з Міністэрствам культуры і Дзяржкамчарнобылем правяла 16–17 лютага 1993 г. у Гомелі прадстаўнічую рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю "Сучасны стан і праблемы выяўлення, выратавання і аховы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ў раёнах, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС”. На ёй падводзіліся некаторыя вынікі працы, вызначаліся кірункі далейшай дзейнасці.

Праграма Дзяржаўнай экспедыцыі ажывіла дзейнасць абласных камісій і цэнтраў абследавання помнікаў. У 1992 г. была створана археалагічная лабараторыя як структурнае падраздзяленне ў межах навукова-даследчага цэнтра Магілёўскага дзяржуніверсітэта, а ў 1999 г. – кафедра археалогіі і спецыяльных дысцыплін гэтай ВНУ. Аб'яднанне намаганняў універсітэта, упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама і Абласнога краязнаўчага музея дало магчымасць да канца 2000 г. вызначыць археалагічны фонд у 15 абследаваных раёнах Магілёўшчыны, які складаўся больш як з 2 тысяч помнікаў [2, с. 42].

За перыяд сваёй дзейнасці Дзяржаўная экспедыцыя выканала значны аб'ём работы. У супрацоўніцтве з міністэрствамі культуры і па надзвычайных сітуацыях, інстытутамі мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, мовазнаўства і гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, навукова-даследчымі інстытутамі горадабудаўніцтва і Белпраектрэстаўрацыя, Гомельскім і Магілёўскім дзяржуніверсітэтамі, краязнаўчымі музеямі, Беларускім дзяржаўным музеем народнай архітэктуры і побыту, вытворчым аб'яднаннем Белвідэацэнтр, Беларускім грамадскім таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры быў створаны банк даных аб гісторыка-культурных каштоўнасцях у 10 раёнах Гомельскай і 6 раёнах Магілёўскай абласцей, якія найбольш пацярпелі ад наступстваў катастрофы [4, с. 112].

Згодна з заказам Міністэрства культуры, супрацоўнікамі рэспубліканскага аб'яднання Белвідэацэнтр і Дзяржаўнай гісторыка-культурнай экспедыцыі быў створаны шэраг відэафільмаў аб народных традыцыях, фальклорных калектывах, народных тэатрах, майстрах і ўмельцах Веткаўскага, Брагінскага раёнаў Гомельскай вобласці, а таксама Краснапольскага і яшчэ шасці раёнаў Магілёўскай вобласці.

З 1991г. Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі рэалізуецца праграма “Помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры Беларусі — раёнаў радыяцыйнага забруджання” (кіраўнік доктар філалагічных навук, прафесар А.С.Фядосік). Супрацоўнікамі інстытута арганізавана фіксацыя фальклорнай спадчыны ў Нараўлянскім, Брагінскім, Кармянскім, Добрушскім, Буда-Кашалёўскім, Ельскім, Чэрыкаўскім, Касцюковіцкім, Клімавіцкім, Слаўгарадскім, Быхаўскім раёнах. Сабрана і запісана на магнітную стужку больш за 1600 фальклорных твораў у раёнах радыяцыйнага забруджання і каля 1500 – у месцах, куды былі перaселены жыхары з чарнобыльскай зоны. У гэтай справе прымалі ўдзел культработнікі, настаўнікі, студэнты і выкладчыкі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Завершана работа ў Чачэрскім, Буда-Кашалёўскім, Ельскім, Добрушскім, Мазырскім раёнах па тэме “Даследаванне і фіксацыя асаблівасцей мовы і духоўнай культуры насельніцтва Палескага рэгіёну, пацярпелага ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС”, якую на працягу двух гадоў вёў Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа АН Беларусі. Абагульненыя матэрыялы выдадзены ў 1994 г.

Праведзена тэарэтычнае даследаванне “Народнае мастацтва і мастацкія промыслы зоны, пацярпелай ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС” (выканавец доктар мастацтвазнаўства Я.М. Сахута).

Склалася група спецыялістаў-энтузіястаў, якія выратоўваюць прадметы старадаўняй беларускай культуры, нягледзячы на ўсю небяспечнасць работы ў пакінутых вёсках. Гэта перш за ўсё загадчык аддзела Інстытута мастацтва- знаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі доктар мастацтвазнаўства Віктар Фёдаравіч Шматаў, яго калегі М.П.Мельнікаў, Л.Я.Агеева, В.Р.Карэлін, галоўны захавальнік фондаў Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту В.А. Малюшына і многія іншыя. За час экспедыцый у Брагінскі, Слаўгарадскі, Кармянскі, Нараўлянскі раёны знойдзены, дэзактываваны і вывезены з адселеных вёсак больш за 700 прадметаў старадаўняй народнай культуры, многія з якіх склалі першую ў рэспубліцы экспазіцыю выратаваных каштоўнасцей у Музеі старажытнай беларускай культуры. Толькі ў час экспедыцыі 1993г. у 30-кіламетровую зону ў Нараўлянскім раёне супрацоўнікамі Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту знойдзены каля 200 прадметаў музейнага значэння. У чэрвені 1994г. такая 10-дзённая экспедыцыя плённа папрацавала ў Касцюковіцкім і Клімавіцкім раёнах [6, с. 71].

Напярэдадні дзевятай гадавіны аварыі на Чарнобыльскай АЭС 25 красавіка 1995г. быў афіцыйна адкрыты аддзел помнікаў этнаграфіі і народнага мастацтва чарнобыльскай зоны ў Музеі старажытнай беларускай культуры ІМЭФ АН Беларусі. У яго ўвайшлі лепшыя помнікі, сабраныя ў чарнобыльскай зоне супрацоўнікамі музея ў час экспедыцый 1991 – 1994 гг. Гэта пакуль што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адзіны такі аддзел у краінах СНД. Большасць помнікаў сабраны на Гомельшчыне (Брагінскі раён), частка — на Магілёўшчыне.

У рабоце з археалагічнымі помнікамі галоўны напрамак дзейнасці – даследаванне іх стану, дакладная фіксацыя на мясцовасці і тапаграфічных картах. У выніку археалагічных экспедыцый праведзена грунтоўнае даследаванне Быхаўскага, Касцюковіцкага, Клімавіцкага, Слаўгарадскага і Краснапольскага раёнаў з мэтай фіксацыі і выяўлення новых помнікаў археалогіі.

Аднак справа з даследаваннем помнікаў археалогіі застаецца даволі праблематычнай. З-за вялікай радыяцыі ніхто цяпер археалагічных раскопак не вядзе. Гэта з аднаго боку. З другога, за 20 гадоў пасля аварыі адселеныя тэрыторыі ператварыліся ў цяжкадаступныя месцы, дзе нават навукоўцы не могуць ужо знайсці тыя старажытныя курганы, што, як правіла, знаходзяцца ў полі, у лесе, на берагах рэк.

Таму карысную справу зрабіў са сваімі калегамі археолаг кандыдат гістарычных навук А.А.Макушнікаў, у нядаўнім мінулым кіраўнік Гомельскага археалагічнага цэнтра, а цяпер навуковы супрацоўнік Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Удакладненне стратыграфіі захаванасці помнікаў і вызначэнне межаў іх ахоўных зон, правядзенне фотафіксацыі і пашпартызацыі помнікаў, збор археалагічнай калекцыі – усё гэта на рахунку навукоўцаў. Імі складзены археалагічныя карты, якія дасланы кіраўніцтву раёнаў і нават сельсаветаў. Пасля адпаведнай інфармацыі Веткаўскім райвыканкамам і Гомельскім аблвыканкамам былі прыняты адпаведныя рашэнні, і далейшае разбурэнне помніка археалогіі ва ўрочышчах Селішча і Цялячча паблізу г. Веткі было прадухілена.

У Магілёўскай вобласці (у пяці раёнах з шасці, пацярпелых ад радыяцыі) аналагічную работу па абследаванні, пашпартызацыі і складанні праектаў ахоўных зон археалагічных помнікаў правялі навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН Беларусі, кандыдат гістарычных навук А.А. Мяцельскі і супрацоўнікі БелНДІ горадабудаўніцтва (кіраўнік праекта Ю.У. Чантурыя). Археалагічнай спадчынай зоны актыўна займаюцца магілёўскі археолаг прафесар В.Ф. Капыцін і яго калегі з Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.Куляшова. У 1993 г. імі завершана даследаванне, і ў 1994 г. выйшлі ў свет навукова-даведачнае выданне “Археалагічныя помнікі Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці” і аналагічнае выданне аб помніках Быхаўскага раёна, завершаны даследаванні археалагічна адметных мясцін Клімавіцкага раёна. Вынікам работы з'явіліся падрыхтоўка і выданне падрабязных археалагічных карт па шасці раёнах Магілёўшчыны, а таксама выданне “Збору помнікаў археалогіі чарнобыльскай зоны Магілёўскай вобласці” [2, с. 43].

Што датычыцца помнікаў архітэктуры, то значная работа па іх фіксацыі, распрацоўцы праектаў ахоўных зон праведзена ў Гомельскай вобласці. Даследаваны стан помніка драўлянага дойлідства XIX ст. – царквы ў вёсцы Вылева Добрушскага раёна, падрыхтаваны праект яе рэстаўрацыі з улікам магчымага пераносу ў г.п. Церахоўка. Выкананы таксама праект схематычных абмерных чарцяжоў драўлянага дойлідства ў вёсках Дудзічы Чачэрскага, Крупец Добрушскага, Куляшоўка Клімавіцкага, Гаўрыленка і Канічы Касцюковіцкага раёнаў.

Практычна не пачаты работы па кансервацыі помнікаў у адселенай зоне, у прыватнасці царквы ў вёсцы Самацеевічы Касцюковіцкага і палацава-паркавага ансамбля ў вёсцы Дзям'янкі Добрушскага раёнаў.

Трохі ў лепшым стане знаходзяцца архітэктурныя аб'екты ў кантралюемай зоне пражывання. За кошт дзяржаўных сродкаў і мясцовага бюджэту адрэстаўрыраваны царква ў г. Слаўгарадзе і ратуша ў г. Чачэрску.

Такім чынам, відавочна, што чарнобыльская бяда нанесла велізарныя страты гісторыка-культурнай спадчыне Беларусі. Многае ўжо не вернецца, але наш абавязак ратаваць і захаваць тое, што засталося. Не адразу былі зроблены патрэбныя крокі ў гэтым кірунку. Аднак, дзякуючы навукоўцам, аматарам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным установам і музеям, удалося многае зрабіць у вырашэнні пытанняў захавання гісторыка-культурнай спадчыны чарнобыльскай зоны. Былі праведзены этнаграфічныя, фальклорныя, археалагічныя экспедыцыі ў пацярпелыя ад аварыі раёны, назапашаны навуковы матэрыял, выдадзены працы па многіх кірунках нацыянальнай культуры чарнобыльскай зоны. Асобая заслуга ў гэтым Дзяржаўнай экспедыцыі, якая за пяць гадоў працы назапасіла багаты матэрыял аб помніках гісторыі і культуры. Таму яе ліквідацыя ў 2000 г. стала адчувальнай у плане сур'ёзнай, планамернай і мэтанакіраванай дзейнасці па выратаванні помнікаў гісторыі і культуры ў раёнах, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а галоўнае, у плане каардынацыі дзейнасці рэспубліканскіх міністэрстваў і ведамстваў, абласных улад у гэтым важным напрамку.

Пытанні захавання гісторыка-культурнай спадчыны чарнобыльскай зоны застаюцца вострымі і праз 20 гадоў.


1. *Віталева, В.* З гісторыі населеных пунктаў / В.Віталева // Памяць. Нараўлянскі раён / рэдкал.: Г.П.Пашкоў [і інш.]. – Мн., 1998.

2. *Копытин, В.* Проблемы охраны памятников археологии чернобыльской зоны Могилёвщины / В.Копытин // Каштоўнасці мінуўшчыны. – 2001. – № 4.

3. *Крупнейчанка, В.П.* Боль мой, чарнобыль... / В.П.Крупнейчанка // Памяць. Лоеўскі раён / рэдкал.: Г.П.Пашкоў [і інш.]. – Мн., 2000.

4. *Нацыянальны* даклад. 15 гадоў пасля Чарнобыльскай катастрофы: вынікі ў Рэспубліцы Беларусь і іх пераадоленне / пад рэд. В.Е.Шаўчука, В.Л. Гурачэўскага. – Мн., 2001.

5. *Памяць.* Веткаўскі раён / рэдкал.: Г.П.Пашкоў [і інш.]. – Мн., 1998. – Кн. 2.

6. *Філістовіч, М.* Спадчына чарнобыльскай зоны: праблемы захавання / М.Філістовіч // Беларускі гістарычны часопіс. – 1994.– № 3.

7. *Чарнобыль.* Погляд праз дзесяцігоддзі: даведнік. – Мн., 1996.

8. *Шары, Г.* Помнікі драўлянага дойлідства Усходняга Палесся / Г.Шары // Каштоўнасці мінуўшчыны. –1999.– № 2.

9. *Шматаў, В.* Мастацкія скарбы / В.Шматаў // Памяць. Нараўлянскі раён / рэдкал.: Г.П.Пашкоў [і інш.]. – Мн., 1998.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ